*Зельскі, А. Г.* Пантыйскі флот на першым этапе Першай мітрыдатавай вайны / А. Г. Зельскі // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 72-76.

***А. Г. Зельскі***

# ПАНТЫЙСКІ ФЛОТ НА ПЕРШЫМ ЭТАПЕ ПЕРШАЙ МІТРЫДАТАВАЙ ВАЙНЫ

У знешняй палітыцы цара Мітрыдата VI флот займаў асаблівае месца. Нагадаем, што ажыццяўленне планаў цара па стварэнню дзяржавы, якая ахоплівала ўзбярэжныя тэрыторыі Понта Эўксінскага, было немагчыма без флоту.

Пэўныя звесткі мы маем адносна флоту. Пантыйскае царства займела флот даволі позна, у часы Фарнака І. Безумоўна, што ўжо да часу прыходу да ўлады Мітрыдата VI, Пантыйскае царства валодала ўжо дастаткова моцным флотам, без якога не былі б ажыццёўлены экспедыцыя Дыяфанта ў Крым, далучэнне Херсанэса, Баспора, Ольвіі, а таксама ваенныя аперацыі ў Заходнім Прычарнамор’і.

Аб колькасці і тыпах ваенных суднаў, якімі валодаў Мітрыдат VI, мы ведаем са сведчанняў, што адносяцца да пачатку І Пантыйскай вайны. Апіян перадае, што ў пантыйскім флоце было 300 палубных і 100 караблёў з двума шэрагамі вёслаў. Лічыцца, што гэтыя лічбы значна пераболышаны. У прыватнасці, Я. Крамаер даводзіць, што рэальна пантыйскі цар меў каля 150 караблёў, абгрунтоўваючы гэта тым, што флот Архелая налічваў 70—80 караблёў і нібыта складаў палову пантыйскага флоту, таму што Мітрыдат не пагаджаўся перадаць яго Суле падчас перамоваў у Дэліі і Дардане. Можна пагадзіцца з думкай Н. Ю. Ламоўры, што доказы гэтыя не зусім пераканаўчыя. У крыніцах няма звестак, быў флот Архелая 1/2 ці 1/5 часткай пантыйскага флоту. Але не выключана, што лічба Апіяна ў пэўным сэнсе не зусім справядлівая. Плутарх кажа, што рыхтуючыся да вайны з Рымам, трэцяй па ліку, Мітрыдат «рыхтаваў караблі, поўныя зброі і кідальных снарадаў, і без



вызалачаных шатроў, бань... і багатых пакояў для жанчын, як у першую вайну». Зразумела, што баявыя якасці такіх раскошных суднаў былі невялікія. Верагодна таксама, што пэўную частку караблёў складалі транспартныя судны.

Натуральна, што флот будаваўся не адзін год. І калі прыняць тое, што кошт будаўніцтва карабля ацэньваўся ў адзін атычны талант, то атрыманая лічба затрат значная, але цалкам рэалістычная для скарбніцы Мітрыдата. Аднак болып значныя сумы ішлі па ўтрыманне флоту: кожны грабец атрымоўваў штодня ў якасці платы і на харчаванне каля 1 драхмы. Экіпаж трыеры складаўся з 200 чалавек. Такім чынам, кожная трыера штодня абыходзілася ў 200 драхм, ці ў 2 міны срэбра. За месяц іх будзе ўжо 60 — роўна 1 талант. Хаця гэтыя даныя адносяцца да болып ранніх часоў, трэба думаць, што ў Мітрыдата выдаткі былі не меншыя.

Флот будаваўся, відавочна, як у Понце, так і ў Калхідзе. Апошняя была сапраўдным арсеналам для забеспячэння ўсім неабходным пантыйскай арміі і асабліва флоту. Страбон характарызуе Калхіду як пастаўшчыка ўсяго неабходнага для будаўніцтва флоту — карабельнага лесу, смалы, пянькі, воску. У Калхідзе была развіта вытворчасць выдатнага валакністага льну, неабходнага для ветразяў. І хаця ў раёне

Сінопы і ў іншых месцах Пантыйскага ўзбярэжжа меліся ўласныя лясныя масівы, але валоданне Калхідай давала магчымасць на месцы будаваць і аснашчаць караблі.

На пачатку вайны флот падтрымліваў правы фланг наступаючай пантыйскай арміі. Увесну 88 г. да н. э. флот падышоў да праліваў у Понт Эўксінскі, авалодаў імі і захапіў караблі рымскай эскадры. Камандуючыя ёю рымляне збеглі. Караблі Мітрыдата выйшлі ў Эгейскае мора. Прасоўваючыся ўздоўж узбярэжжа Малой Азіі, флот таксама садзейнічаў пераходу прыморскіх гарадоў на бок Мітрыдата. Улетку 88 г. да н. э. флот пачаў займаць Кіклады. Толькі Радос, дзе знаходзіўся значны рымскі гарнізон, аказаў цару супраціўленне. Сюды ўцякалі з Азіі ацалелыя італійцы. Туды ж прыбыў праконсул Азіі Луцый Касій. Радос меў важнае стратэгічнае і эканамічнае значэнне. Тут злучаліся марскія шляхі з Понта ў Александрыю.

Марскія баі каля в. Радос былі першым значным выпрабаваннем пантыйскага флоту. Радосцы мелі нешматлікі, але добра вывучаны ваенны флот. Караблі радосцаў былі больш хуткія, чым пентэры пантыйцаў. У марскіх баях радосцы прымянялі брандэры — металічныя кашы з гаручым. Высунутыя на доўгіх шастах у мора, яны служылі для падпальвання варожых караблёў. Існуе думка, што гэта мог быць «грэчаскі агонь».



Калі пантыйскі флот падышоў да вострава, радоская эскадра, не зважаючы на перавагу пантыйцаў, атакавала іх караблі з флангаў і проста ў лоб. Мітрыдат загадаў сваім караблям адысці ў адкрытае мора, зайсці праціўніку ў фланг і акружыць хаця і хуткасны, але нешматлікі флот ворага. Радосцы, бачачы, што могуць быць акружаны, пачалі адыходзіць, а пасля ўвогуле пакінулі месца бою і, карыстаючыся перавагай у хуткасці, вярнуліся ў гавань. Колькасць абодвух флатоў крыніцы не адзначылі. Магчыма, што радоскі флот налічваў крыху болып за дзесяць баявых караблёў, у той жа час як Мітрыдат меў некалькі дзесяткаў караблёў, бо вядома, што ў наступных баях удзельнічала да 25 караблёў.

Далей удзел пантыйскага флоту ў аперацыях каля Радоса быў зведзены да блакады гаваняў горада, падвозу грузаў і войскаў, канваіравання транспартных караблёў. У гэтых марскіх баях колькасная перавага пантыйскага флоту не адыграла істотнай ролі. Відавочна, што адсутнічала агульнае кіраўніцтва дзеяннямі флоту, які выкарыстоўваўся выпадкова і хаатычна. Спробы атрымаць дапамогу ад караблёў для штурму Радоса з боку мора (усталяванне на караблях «самбукі» і інш. ваенных машын) таксама былі няўдалыя.

Пасля няўдач у штурмах Мітрыдат зняў аблогу, адмовіўшыся ад захопу Радоса. Востраў, які меў важнае стратэгічнае значэнне, а таксама частка сушы насупраць яго, засталіся ў руках рымлян. Гэта пасля адмоўна адаб’ецца на далейшым ходзе вайны.

Неабходнасць мець умацаваную ваенна-марскую базу ў Памфілійскім моры дзеля кантролю над Радосам прымусіла Мітрыдата пачаць аблогу Патараў — вялікага горада з гаванню і свяцілішчам Алалона. Аднак хутка аблога была згорнута. Апіян гэта тлумачыць тым, што прымхлівы пантыйскі цар убачыў нядобрыя сны і таму згарнуў аблогу. Але маглі быць і нейкія іншыя прычыны, якія нам засталіся невядомымі. Адной з іх магла быць неабходнасць пачаць актыўныя баявыя дзеянні ў Грэцыі.

Восенню 88 г. да н. э. пантыйскі флот на чале з Архелаем канчаткова авалодаў Эгейскім морам. Болыпая частка астравоў перайпіла на яго бок без бою. Галоўным апорным пунктам рымлян у рэгіёне заставаўся востраў Дэлас. Удар супраць Дэласа быў скіраваны з мэтай знішчыць апорны пункт рымлян, дапамагчы афінянам, якія за некалькі год да таго беспаспяхова спрабавалі авалодаць востравам. Антычныя аўтары

па-рознаму называюць правадыроў гэтага паходу — Архелай альбо Менафан. Аднак супярэчнасці тут няма, бо Менафан, які ўзначальваў эскадру, дзейнічаў пад агульным кіраўніцтвам Архелая.



У кастрычніку 88 г. да н. э., падышоўшы з флотам да вострава, Менафан захапіў яго штурмам. Адбылася разня, падчас якой было перабіта каля 20 тыс. італікаў. Лічба выклікае пэўныя сумненні — адкуль на востраве магла ўзяцца такая колькасць італікаў? Магчыма тут маюцца на ўвазе і жыхары вострава. Сам Дэлас быў разбураны дашчэнту. Аднак трэба адзначыць, што ацалелыя ад разні купцы арганізаваліся і, зрабіўшы засаду, патапілі карабель Менафана. Верагодна, што менавіта дэласкія піраты пайшлі на службу да рымскага легата Бруція Суры, склаўшы яго эскадру. У барацьбе з ёй эскадра пантыйскага стратэга Метрафана пацярпела ішражэнне. Метрафан згубіў два караблі і марскую базу на востраве Скіаф. Аднак ён утрымаў Эўбею, што пасля дапамагло пантыйцам.

Перадача Дэласа пад кантроль Афінаў паўплывала на іх рашэнне аб далучэнні да Мітрыдата. Пірэй стаў ваенна-марской базай пантыйскага флоту.

Увесну 87 г. да н. э. Л. К. Сула высадзіўся ў Эпіры з пяццю легіёнамі, некалькімі маніпуламі і атрадамі конніцы. Аб самой пераправе антычныя крыніцы не паведамляюць. Транспартны карабель тых часоў забіраў прыблізна 200—220 салдат. Такім чынам для пераправы 30 тыс. арміі было неабходна мець 140—150 транспартаў. Наўрад ці ў веданні Сулы была такая колькасць караблёў. Хутчэй за ўсё войска перапраўлялася па частках, а значыць і канцэнтрацыя яго ў Эпіры адбывалася паступова.

У абароне Пірэя і Афін пантыйскі флот адыграў значную ролю. Караблі падвозілі рыштунак, харчаванне, падмацаванні, нават такія буйныя, як корпус Драміхета, матросы ўдзельнічалі ў абароне Пірэя.

Без флоту для Сулы было зусім немагчыма не толькі падтрымліваць рэгулярную сувязь з Італіяй і забяспечыць падвоз падмацаваняў, але і авалодаць Пірэем, не кажучы аб Малой Азіі і астравах. Таму Сула адправіў Луцыя Лукула ў Егіпет і Сірыю з даручэннем набраць там караблі для флоту.

Лукул атрымаў тры бірэмы ад радосцаў і тры караблі ад грэчаскіх абшчын і з імі выйшаў у мора. Плутарх паведамляе, што Лукулу ўдалося схіліць на свой бок крыцян і з іх дапамогаю навесці парадак у Кірэнах. Незразумела, як здолеў Лукул пераканаць крыцян. Крыт быў у той час сапраўднай пірацкай дзяржавай і пагроз піраты не баяліся. Ёсць думка, што Сула вырашыў падзяліцца з крыцянамі нарабаванымі каштоўнасцямі.

На шляху ў Егіпет большая частка караблёў Лукула была захоплена піратамі, але сам Лукул выратаваўся і здолеў дабрацца



да Александрыі. Хутчэй за ўсё, гэта былі крыцкія піраты, якія, вызваліўшыся ад сваіх абавязацельстваў перад Лукулам, патапілі амаль усю яго эскадру. Нездарма рымляне пазней абвінавачвалі крыцян у дапамозе піратам і цару Мітрыдату. У Александрыі рымляніну быў аказаны ўрачысты прыём, аднак двор Пталемея ветліва, але рашуча адмовіў у просьбе дапамагчы рымлянам ваеннымі караблямі. Гэта быў фактычны правал місіі Лукула. Яму нічога не заставалася, як адплыць на Кіпр, а адтуль, засцерагаючыся сустрэч з пантыйскімі і пірацкімі караблямі, ён дабраўся да Радоса.

Пасля падзення Афін і Пірэя Архелай выкарыстоўваў свой флот выключна як транспартны сродак. Караблі перавезлі пантый скіх салдат у Фесалію, а пасля разгрому ў бітве каля Херанэі пераправілі рэшткі арміі праз праліў Эўрып на востраў Эўбея.

Нягледзячы на тое, што першы этап вайны стаў для пантыйскай дзяржавы часам найбольшых поспехаў, флот слаба ўлічваўся пантыйскім камандаваннем як ваенная сіла, ён не адыграў той ролі, якую мог бы зрабіць. Калі спачатку ён дзейнічаў актыўна, захапіўшы пралівы, ведучы баі пад Радосам, то пасля караблі выкарыстоўваюцца толькі для перавозак. Відавочна, што пасля няўдач у марскіх баях пад Радосам Мітрыдат у пэўнай ступені расчараваўся ў флоце. А між тым пантыйскі флот мог калі не цалкам, то хаця б часткова перашкодзіць пераправе арміі Сулы ў Грэцыю. Тут пасіўнасць пантыйцаў малазразумелая. Магчыма, пэўныя надзеі ўскладаліся на піратаў, але яны былі дарэмныя. І гэта пры тым, што ў рымлян практычна не было флоту.